Источник: **«Краязнаўчая газета» - 2012-11-15**

## Дзясятыя карэліцкія

Сёлета ў кастрычніку адбыліся X Карэліцкія краязнаўчыя чытанні «Славутыя роды Карэліччыны», арганізаваныя Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Карэліцкім раённым выканаўчым камітэтам. З прывітальным словам да ўдзельнікаў чытанняў звярнуліся намеснік старшыні Карэліцкага райвыканкама Р. Абрамчык і выконваючы абавязкі дырэктара па навуковай частцы Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. Лакіза. Да мерапрыемства супрацоўнікі Карэліцкай цэнтральнай раённай бібліятэкі падрыхтавалі кніжную выставу «Любы сэрцу Карэліцкі край», дзе былі прадстаўленыя кнігі аб гісторыі і сучаснасці раёна, яго славутых людзях.

Прысутныя пазнаёміліся таксама з выставай вырабаў дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва супрацоўнікаў Карэліцкага раённага Дома рамёстваў і выставай працаў беларускага мастака, нашага земляка, В. Рамановіча, арганізаванай Карэліцкім раённым краязнаўчым музеем.

Краязнаўчыя чытанні падкрэсліваюць пільную ўвагу да невялікіх населеных пунктаў, іх гісторыі, якая не менш значная, чым гісторыя ўсёй дзяржавы. Адна з мэтаў чытанняў – папулярызацыя навуковых ведаў, якія не павінны быць здабыткам вузкага кола навукоўцаў. Інфармацыю, прапанаваную даследчыкамі, можна і трэба выкарыстоўваць супрацоўнікам бібліятэк, музеяў, настаўнікам, краязнаўцам.

***Лілія АРЦЮХ, дырэктар Карэліцкай ЦБС***